Источник: "Народная воля" - 2014-04-08

## ЭКСПЕРЫМЕНТ

# *Бульба, якая не баіцца жука?*

У гэтым годзе Беларусь упершыню правядзе палявыя выпрабаванні генетычна мадыфікаванай бульбы. Пра гэта паведаміў дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі **Аляксандр Кільчэўскі.**

У мінулым годзе беларускую трансгенную бульбу з падвышанай устойлівасцю да хвароб і каларадскага жука высадзілі ў цяпліцах для атрымання насеннага матэрыялу, а ў гэтым годзе яе ўпершыню змесцяць у адкрыты грунт на біялагічным доследным участку, што знаходзіцца ў Мінску.

Аб камерцыйным выкарыстанні геннамадыфікаванай бульбы можна будзе казаць толькі праз два-тры гады пасля правядзення палявых выпрабаванняў.